✓**4 і 5 верасня** НББ брала ўдзел у **святкаванні XXVIII Дня беларускага пісьменства**, што прайшло ў г. Капыль. Вядучы кнігазбор дзяржавы зладзіў шэраг мерапрыемстваў. Прайшла прэзентацыя анлайн-энцыклапедыі «Беларусь у асобах і падзеях». Гэта крыніца актуальнай і дакладнай інфармацыі пра найбольш важныя падзеі ў эканамічнай, грамадска-палітычнай, культурнай і іншых сферах жыцця краіны, пра вядомых людзей, помнікі гісторыі, культуры, археалогіі, прыроды Беларусі. Кніжная выстава «Літаратурная спадчына Капыльшчыны» прадставіла больш як 30 прыжыццёвых выданняў, асобнікаў з аўтографамі і самых значных твораў, а таксама перакладную літаратуру са спадчыны Сцяпана Александровіча, Алеся Гурло, Цішкі Гартнага. У Капыльскім раённым цэнтры культуры прадставілі раздзелы, створаныя да юбілеяў пісьменнікаў-маладнякоўцаў, сярод якіх ёсць і вядомыя ўраджэнцы Капыльшчыны Кузьма Чорны і Ян Скрыган (гэта частка сумеснага з Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры, Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва і Выдавецкім домам «Звязда» віртуальнага праекта «На хвалі часу, у плыні жыцця» да 100-годдзя літаратурнага аб'яднання «Маладняк»).

Капыльшчына – самабытны і маляўнічы край з багатай гісторыяй і культурнымі традыцыямі, радзіма больш як 50-і пісьменнікаў. Пазнаёміцца з месцамі жыцця і дзейнасцю таленавітых і знакамітых землякоў можна было 5 верасня ў Капыльскім РЦК.